## 6 ГЕНДАРНАЯ АСІМЕТРЫЯ І ГЕНДАРНЫЯ СТЭРЭАТЫПЫ Ў ТВОРАХ ПІСЬМЕННІКАЎ ХХ СТ.: Я. КОЛАС

1 Рознасць паміж духоўнымі патрабаваннямі гераінь у трылогіі Я.Коласа «На ростанях».

2 Гендарная асіметрыя грамадства пачатку ХХ ст.

3 Прававая неабароненасць жанчыны-маці ў творы Я.Коласа.

### 1 Рознасць паміж духоўнымі патрабаваннямі гераінь у трылогіі Я.Коласа «На ростанях».

Беларуская літаратура ХХ стагоддзя (чытай пісьменнікі-мужчыны) падаравала нам такія вобразы жанчын, як Бандароўна, Ядвіся, Люба Лук'янская, Ганна Чарнушка, Сцепаніда Багацька, Алімпіяда. Сюды варта дадаць гераінь Я.Брыля, І.Шамякіна, У.Караткевіча, У.Арлова, сумарны вобраз беларускай жанчыны з кнігі Я.Сіпакова «Жанчына сярод мужчын» і многіх іншых.

Згаданыя вобразы створаныя ў розныя гістарычныя часы. Але ўсе яны адлюстравалі стэрэатыпы грамадства ў пэўны перыяд яго развіцця і адначасна фармавалі іх (І.Шаберт), ствараючы міф аб беларускай жанчыне мінулага стагоддзя. Бясспрэчна, гэтыя вобразы ўвабралі ў сябе ўяўленні аўтараў пра жанчыну як носьбітку лепшых маральных якасцей народа, захавальніцу духоўнасці, якую жанчына, выхоўваючы новыя пакаленні, перадавала ў спадчыну. Пісьменнікі адлюстравалі найбольш тыповыя і пры гэтым лепшыя рысы характару прадстаўніц прыгожай паловы свайго народа, стварылі «тып жанчыны як духоўнага ідэалу».

Звернемся да гераінь Я.Коласа, прадстаўленых у трылогіі. Праз бачанне Лабановіча, які здольны крытычна ацаніць жанчыну нават тады, калі яго сэрца палонена ёю, аўтар падкрэслівае рознасць паміж жанчынамі, якая, нягледзячы на палітыку дзяржавы і грамадства ў адносінах да апошніх увогуле, залежыць і ад іх саслоўнай прыналежнасці, і ад іх адукаванасці. Прымем пад увагу і той факт, што ў грамадстве заўсёды паралельна існуюць розныя канцэпты жаноцкасці. Лабановіча, як памятаем, заўсёды хвалявала прыгажосць, жаночая ў тым ліку. Хараство жанчыны для яго (як і для іншых прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва ў творы) выступае мерай каштоўнасці дзяўчыны, ва ўсякім выпадку на першапачатковым этапе знаёмства. Герой падпарадкоўваецца агульнапрынятаму стэрэатыпу прыгажосці, што вельмі добра даказваюць наступныя радкі: *«А раз у дачку каморніка ўсе закаханы, то яна, без спрэчкі, ёсць верх хараства»*. Перавага панны Людмілы (дачкі каморніка) над іншымі дзяўчатамі яшчэ раз падкрэслівае залежнасць жанчыны ад свайго цела, яго прывабнасці (І.Саўкіна). І як вынік – прыгажосць мае больш прэтэнзій на шчасце (лепшае замужжа). Але, на наш погляд, тут якраз схавана «пастка» для жанчыны – пачатак канфлікту з сабой і акаляючым светам, бо прэтэнзіі не заўсёды сябе апраўдваюць. Прыгажосць у дадзеным выпадку выступае ў якасці тавару і не можа з'яўляцца гарантам будучага шчасця. Мера шчасця дзяўчыны ў творы (як і ў грамадстве) вызначаецца адсутнасцю ці наяўнасцю жаніха і ўзростам, што гаворыць аб пасіўнасці дзяўчыны, чаканні «некага», хто прыйдзе і вырашыць яе лёс. Эпізод пра наведванне Лабановічам пісаранак яркае таму сведчанне. Ва ўсякім разе пра старэйшую Маню малады настаўнік кажа так: *«Яна была ... даволі прыгожая з твару; але разам з гэтым было на ім і нешта такое, што рабіла яго сярдзітым, злым. Напэўна доўгае чаканне свайго суджанага ... мела свой ўплыў ...»*. Сярэдняя Саша *«была*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*шчаслівейшая ..., бо мела жаніха ў асобе тутэйшага ўрадніка»*.

Лабановіч, хоць і шануе хараство, усё ж аддае перавагу дзейсным і духоўна адораным дзяўчатам: Ядвісі, Вользе Андросавай. Але ў выніку аказваецца, што яны таксама шукаюць свой шлях у жыцці, таму іх дарогі і шлях Лабановіча не супадаюць. Гендарна арыентаваны чытач здольны заўважыць, што аўтар дакументуе традыцыйную ва ўзаемаадносінах полаў асіметрыю, якая праяўляецца ў тым, што функцыю падпарадкавання выконвае жанчына, яна павінна адмовіцца ад асабістага жыцця (ці зрабіць асабістым жыццём жыццё мужа) і пайсці «за мужам», гаспадаром. Ні Ядвіся, ні Вольга Андросава не гатовы да гэтага на тым адрэзку жыцця, што апісаны ў творы.

Нерашучасць Ядвісі ў адносінах з Лабановічам – комплекс, звязаны з яе мінулым і сучасным сямейным жыццём, смерцю маці, яшчэ амаль дзіцячым узростам, непаразуменнямі паміж закаханымі. Але варта звярнуць увагу і на яе планы, на будучае дзяўчыны. Ядвіся жыла прагай іншага, больш змястоўнага жыцця і верыла, што дзесьці далёка яно ёсць. Дзяўчына рвалася туды. Комплекс страху, які праяўляецца ў боязі бацькі, нянавісці да яго, нават адчаі становіцца для Ядвісі прычынай боязі замужжа ўвогуле. Але гэты комплекс мае і адваротны – станоўчы – бок. Менавіта ён рухае Ядвісю наперад як асобу, развівае яе духоўнасць і розум. Яна больш баіцца замужжа, чым кахае Лабановіча, таму «ўцякае» ад яго ў шырэйшы свет, дзе ёсць перспектыва для самарэалізацыі. І калі ўспомніць, што вобраз Ядвісі мае сваім прататыпам жанчыну дзейсную і творчую (Ядвісю Бараноўскую), якая спрабавала свае сілы ў літаратуры (друкавала вершы ў «Нашай ніве»), то вобраз гераіні робіцца яшчэ больш зразумелым.

Гендар як новы крытычны падыход па-іншаму дазваляе зірнуць на вобраз Вольгі Андросавай. Яго варта разглядаць як альтэрнатыўны ўсім астатнім стэрэатып паводзін і магчымасцей. Яе вобраз для пачатку ХХ ст. – выключэнне з правіла. Адукацыя як адзін са шляхоў паляпшэння становішча жанчыны, дае Вользе Віктараўне адносную самастойнасць і перспектыву ў жыцці. Жанчына ў дадзеным выпадку нават больш дзейсная, чым многія мужчыны твора, у тым ліку і сябры галоўнага героя. Менавіта яна падштурхоўвае Лабановіча да актыўнай палітычнай дзейнасці. Аналітык Лабановіч характарызуе Вольгу Андросаву пры першай сустрэчы як «тургенеўскую нігілістку», а потым адносіны да яе ён выражае такімі словамі: *«У яе асобе ён бачыў першую такую дзяўчыну і прасякся да яе вялікаю павагаю»*. Такім чынам, малады настаўнік можа ўпершыню глянуў на жанчыну як на роўную сабе істоту, якая здольна нават павесці за сабою. Перавод Лабановіча ў Верхань адрывае яго і ад Андросавай, і ад рэвалюцыйнай арганізацыі.

## 2 Гендарная асіметрыя грамадства пачатку ХХ ст.

Я.Колас у трылогіі адлюстраваў гендарную асіметрыю грамадства ў пачатку ХХ ст. Ужо той факт, што галоўны герой твора – мужчына, гаворыць аб дамінаванні мужчынскага ў жыцці і літаратуры пачатку мінулага стагоддзя. Я.Колас падае шырокі матэрыял для аналізу. Вядома, жанчыны ў той час не адыгрывалі ў грамадстве сацыяльна значных роляў, таму ўсе кіруючыя пасады займалі мужчыны: старасты, прадстаўнікі валаснога ўпраўлення, духавенства. Жанчыны ж у творы характарызуюцца праз адносіны да мужчын: як чыесьці жонкі ці дочкі («Жанчына без мужчыны з пункту гледжання сацыяльнага дэкласавана».). Асобна можна выдзеліць хіба старожак і Вольгу Андросаву. Праўда, наша задача не абмяжоўваецца рэабілітацыяй жаночых вобразаў трылогіі, яна ў тым, каб

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

звярнуць увагу на гендарную асіметрыю ў тэксце, на праблему мужчынскага дамінавання і ўлады, якая праяўляецца на розных ступенях узаемаадносін паміж поламі.

Гендарная асіметрыя твора праяўляецца і праз адносіны грамадства, у асобах вясковых бацькоў, да адукацыі. Яны лічылі быццам адукацыя дзяўчынкам зусім не патрэбна. Сцэны ў трылогіі аб тым, як бацькі адпраўлялі дзяцей у школу, яркае таму сведчанне: у Цельшына ў класе Лабановіча не было ніводнай дзяўчынкі, у Выганах на пачатку таксама, і толькі ў Верхані дзяўчаты складалі трэць усіх дзяцей, што вельмі радавала маладога настаўніка. Хоць XX стагоддзе і дало жанчыне магчымасць вучыцца, яе маглі выкарыстаць вельмі нямногія, бо не быў пераадолены стэрэатып разумення «жаночай долі» – прапановы Лабановіча адпраўляць дзяўчат у школу выклікалі ў жыхароў Цельшына смех.

**3 Прававая неабароненасць жанчыны-маці ў творы Я.Коласа.**

Вобраз выганаўскай старожкі Ганны – яркі прыклад безабароннасці і бяспраўя жанчыны перад мужчынам і дзяржавай. Мужчына, незалежна ад адукацыі, у адносінах да жанчыны застаецца на ўзроўні задавальнення сваіх полавых патрэб і яго не цікавіць вынік сексуальных адносін.

Жыццё Ганны ўвесь час (што сведчыць пра яе сацыяльную неабароненасць) напрамую залежыць ад мужчын, а не ад закона: мужа – п'яніцы і жабрака, настаўніка Мітрафана Васільевіча, Лабановіча. Ад пабояў мужа яна-такі здолела ўцячы *(«Біў яе без усякай прычыны, можа, таму, што на свеце жыць нялёгка»*, бо была з ім на роўных у сацыяльным плане. А вось Мітрафану Васільевічу яна супраціўляцца пабаялася, бо не хацела страціць утульнае для яе месца старожкі (жыллё і працу адначасова). Гэтую залежнасць і бяспраўе добра разумее і выгадна выкарыстоўвае папярэднік Лабановіча ў Выганаўскай школе – Мітрафан Васільевіч. Дарэчы, з'язджае ён са школы па прычыне таго, што «выгаднасць» зрабілася яўнай усім жыхарам вёскі. Каб пазбегнуць адказнасці за створанае, Мітрафан Васільевіч пераязджае на новае месца працы. Для параўнання ўзгадаем, што за палітычную ненадзейнасць Лабановіч быў пазбаўлены працы, а потым і волі. За «ненадзейнасць» у адносінах да жанчыны дзяржава і закон ніякіх мер не прымаюць. «Патрыярхальная этыка і рэлігія схільныя змешваць такія ўяўленні, як «сэкс» і «жанчына», быццам цяжар адказнасьці і ганьбы, зьвязаных з сэксам, прыпадае адно на жанчыну. Таму нячысты, грахоўны і шкодны секс зьвязваюць з жанчынай, а лепшыя чалавечыя якасці – з мужчынам».

Ганна з бояззю чакае прысуду Лабановіча: *«Яна так баіцца новага настаўніка. Яна ўпэўнена, што ён скажа ёй выбірацца вон са школы: нашто яна яму такая брыдкая ды яшчэ цяжарная?... Не бываць ёй у школе – і людзі кажуць так... Яна са страхам чакала вырашэння свайго лёсу»*. Пастаянная няўпэўненасць і страх ужо сталі адметнасцю светаўспрымання і дачкі старожкі, *«і яна баіцца яго* (Лабановіча – Ф.Т.)*»*. Самае страшнае ў гэтай сітуацыі, што «людзі кажуць так». Грамадства, якое складаецца з мужчын і жанчын ужо вынесла свой прысуд Ганне як звычайны, жыццёва апраўданы. Для іх з'яўляецца нормай, што жанчына-маці нікому не патрэбна, бо яна не ў стане працаваць у поўную сілу, да таго ж за яе плячыма яшчэ дзве душы патрабуюць ежы. Такім чынам, на пачатку XX ст., грамадства знаходзілася вельмі далёка ад цывілізаванага вырашэння праблемы мацярынства. І ў наш час яно носіць пячатку грахоўнасці, што кладзецца толькі на жанчыну.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пра бяспраўнасць жанчыны ў сям'і гаворыць і той факт, што падлоўчы (бацька Ядвісі) звёў сваю жонку са свету – пра гэта неаднойчы ўзгадваецца ў творы – і застаўся без пакарання. Жонка – яго прыватная ўласнасць, ёю (нават яе жыццём) мужчына можа распараджацца па сваім жаданні.

Выснову з усяго вышэй сказанага мы можам зрабіць наступную: Я.Колас вобразам Ядвісі, іншых дзяўчат і жанчын з трылогіі перадаў рознасць паміж духоўнымі патрабаваннямі гераінь, адлюстраваў зменнасць стэрэатыпаў жаноцкасці ў грамадстве, падкрэсліў гендарную асіметрыю грамадства пачатку XX ст., а таксама звярнуў увагу на прававую неабароненасць жанчыны-маці ў гэты час.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ